## Некаторыя факты

Ніводная дзяржава ў Еўропе не мае працэдуры юрыдычнага прызнання гендара, якая б адпавядала стандартам правоў чалавека. У 2012 г. Аргентына прыняла Закон аб гендарнай ідэнтычнасці, які з павагай ставіцца да правоў чалавека. Згодна з гэтым Законам працэдура юрыдычнага прызнання гендара з’яўляецца хуткай, даступнай і празрыстай. Адпаведна дадзеным Міністэрства ўнутраных спраў Аргентыны, на працягу 12 месяцаў былі зменены 3 000 пасведчанняў асобы. Аргентынская мадэль з’яўляецца простай адміністратыўнай працэдурай і ўяўляе сабой найлепшы ўзор трансгендарнага заканадаўства ў свеце. Яна не патрабуе скасавання шлюбу або згоды мужа ці жонкі, патрабавання стэрылізацыі або медычнага дыягназу. Працэдура, у тым ліку, даступна асобам ва ўзросце да 18 гадоў.

**Трансгендарныя асобы — гэта парасонавы тэрмін для азначэння асобаў, чыя гендарная ідэнтычнасць або гендарная экспрэсія адрозніваюцца ад пола, прыпісанага ім ад нараджэння.**



**ХУТКА.**
**ДАСТУПНА.**
**ПРАЗРЫСТА.**
**ПРЫЗНАННЕ АДЧЫНЯЕ ДЗВЕРЫ.**

### ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ:

# ЮРЫДЫЧНАЕ ПРЫЗНАННЕ ГЕНДАРА

**Даведайцеся больш пра юрыдычнае прызнанне гендара, а таксама пра тое, як палепшыць становішча:**
**www.tgeu.org/accessallareas**

Гэты праект быў здзейснены пры фінансавай падтрымцы Open Society Foundations, Ураду Нідэрландаў і праграмы PROGRESS Еўрапейскага Звязу. Змест гэтай публікацыі з’яўляецца адказнасцю яе аўтар_кі і ніякім чынам ня можа быць выкарастаны для адлюстравання поглядаў Еўрапейскай Камісіі, Open Society Foundations і Ўраду Нідэрландаў.

Пераклад на беларускую мову здзейсніла каманда альманаха «Жанчыны ў палітыцы: новыя падыходы да палітычнага».

ДОСТУП ВА ЎСЕ ПРАСТОРЫ!
ПРЫЗНАННЕ АДЧЫНЯЕ ДЗВЕРЫ

## Што такое юрыдычнае прызнанне гендара?

Юрыдычнае прызнанне гендара — гэта працэс змены імя і гендарнага маркера ў афіцыйных дакументах і запісах з мэтай прызнання правільнай гендарнай ідэнтычнасці чалавека. Дзяржавы вызначаюць патрабаванні да тых, хто атрымае доступ да гэтай працэдуры. Аднак такія патрабаванні як прымусовая стэрылізацыя, прымусовае скасаванне шлюбу, абавязковая пастаноўка псіхіатрычнага дыягназу або узроставыя абмежаванні відавочна парушаюць правы чалавека.

## Чаму важна юрыдычнае прызнанне гендара?



Простыя рэчы, такія як атрыманне паштовых адпраўленняў, адкрыццё рахунку ў банку, выкарыстанне асабістага праязнога квітка, могуць стаць крыніцай штодзённых складанасцей, калі ваш пол, пазначаны ў пасведчанні асобы, пашпарце ці інш., адрозніваецца ад вашай гендарнай ідэнтычнасці. З-за таго, што трансгендарных асобаў часта падазраюць у выкарыстанні дакументаў іншых людзей, яны вымушаны адкрываць сваю трансгендарнасць супраць сваёй волі. Гэта парушае іх правы на прыватнае жыццё і прыводзіць да дыскрымінацыі і гвалту. У выніку многія трансгендарныя асобы аказваюцца выключанымі з грамадства і рынку працы. Да таго ж трансгендарныя асобы не адважваюцца рабіць камін-аўт, што прыводзіць да непакою, дыпрэсіі і суіцыдаў. Выкарыстанне дакументаў, якія не адлюстроўваюць гендар, у якім яны жывуць, з'яўляецца распаўсюджанай прычынай беспрацоўя сярод трансгендарных асобаў.

**Хуткая, даступная і празрыстая працэдура юрыдычнага прызнання гендара прадухіляе дыскрымінацыю, абараняе асабістую прыватнасць і з'яўляецца падмуркам годнага жыцця.**

## Якія праблемы існуюць з юрыдычным прызнаннем гендара ў Еўропе?

**Юрыдычнае прызнанне гендара немагчыма** ў 16 краінах Еўропы з прычыны адсутнасці прававога рэгулявання або з-за таго, што існуючая працэдура не працуе. У выніку трансгендарныя асобы не могуць юрыдычна змяніць дакументы і жыць годна.

**РЭКАМЕНДАВАНА:**
**Перагледзець заканадаўства і стварыць хуткую, даступную і празрыстую працэдуру прызнання гендара.**

**Прымусовая стэрылізацыя** патрабуецца для прызнання гендара ў 23 краінах Еўропы. Гэта відавочна парушае права на фізічную недатыкальнасць, права не падвяргацца катаванням і права мець сям'ю. Не ўсе трансгендарныя асобы здольныя або жадаюць праходзіць праз гэткія медычныя ўмяшанні.

**РЭКАМЕНДАВАНА:**
**Выключыць любыя медычныя патрабаванні з працэдуры юрыдычнага прызнання гендара.**

**Прымусовае скасаванне шлюбу** з'яўляецца абавязковай умовай для змены гендарнага маркера ў 19 краінах Еўропы. Гэта з'яўляецца цяжкім выпрабаваннем для трансгендарных асобаў і іх сем'яў, таму што іх партнёр або партнёрка і дзеці таксама страчваюць правы, якія надае зарэгістраваны шлюб.

Працэс скасавання шлюбу — гэта эмацыйны і фінансавы цяжар, які разрывае блізкіх людзей.

**РЭКАМЕНДАВАНА:**
**Выключыць любыя патрабаванні не знаходзіцца ў шлюбе з працэдуры юрыдычнага прызнання гендара.**

**Псіхіятрычны дыягназ або заключэнне «эксперта» патрабуецца** ва ўсіх працэдурах прызнання гендара ў Еўропе. Гэта значыць, што трансгендарныя асобы лічацца «хворымі», у той час, калі яны такімі не з'яўляюцца. Гэта прыводзіць да стыгматызацыі і сацыяльнай ізаляцыі. Неабходнасць медычнай дыягностыкі не дазваляе прайсці працэдуру юрыдычнага прызнання гендара многім трансгендарным асобам або падоўжвае час атрымання новых дакументаў у некаторых выпадках на многія гады.

**РЭКАМЕНДАВАНА:**
**Выключыць любыя патрабаванні псіхіятрычнага дыягназу і заключэння эксперта з працэдуры юрыдычнага прызнання гендара.**

**Узроставыя абмежаванні** не дазваляюць маладым трансгендарным асобам прайсці працэдуру юрыдычнага прызнання гендара, даступную толькі з паўналецця, звычайна з 18 гадоў (за выключэннем Германіі і Аўстрыі). Гэта перашкаджае сацыяльнай інтэграцыі, напрыклад, у школе, і робіць шкоду развіццю асобы ў крытычным узросце. Медычныя патрабаванні таксама прыводзяць да недаступнасці юрыдычнага прызнання гендара для маладых і сталых, напрыклад, старэйшых за 65 гадоў, трансгендарных асобаў.

**РЭКАМЕНДАВАНА:**
**Выключыць любыя яўныя і няяўныя ўзроставыя абмежаванні з працэдуры юрыдычнага прызнання гендара.**